начали формироваться идеи военных переворотов, особо четко сформированные после Четвертого сейма. Тем не менее, в условиях нарастающего общественного недовольства поляков, российское правительство не пошло ни на какой диалог и еще более усилило реакционную политику.

Таким образом, отсутствие взаимопонимания с великим князем Константином и русским чиновничеством, системные нарушения буквы и духа Конституции 1815 г. привели к восстанию 1830–1831 гг. 25 января 1830 г., после демонстраций интеллигенции, аристократии и студентов, Сейм принял решение о детронизации Николая I и упразднении тех параграфов Конституции, которые касались унии с Россией.

**Литература**

1. Акт Венского конгресса, подписанный 28 мая 1815 г. // Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россией с иностранными державами: в 15 т. / Сост. Ф.Ф. Мартенс. Спб., 1874–1909. Т. 3. Спб., 1876.
2. *Аскенази Ш.* Царство Польское: 1815–1830 гг. / Под ред. А.А. Кизеветтера; пер. с польск. В.Высоцкого. М., 1915.
3. *Василевский Л.* Современная Польша и ее политическое стремление. Спб., 1906.
4. *Любавский М. К.* История западных славян: прибалтийских, чехов и поляков. М., 1917.
5. Конституционная Хартия Царства Польского 1815 года // Конституционная хартия 1815 года и некоторые другие акты бывшего Царства Польского (1814–1881). Спб., 1907.
6. *Студницкий В.* Польша в политическом отношении от разделов до наших дней. Спб., 1907.

## БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІЯ ФАРМІРАВАННІ ПАДЧАС ВАЙНЫ 1812 ГОДА НА БАКУ АРМІІ НАПАЛЕОНА: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

**А. С. Луцэвіч**

Беларускія землі згулялі своеасаблівую ролю ў вайне 1812 г., і вывучэнне гэтай праблемы патрабуе даследавання шматлікіх пытанняў. Адным з іх з’яўляецца дзейнасць беларуска-літоўскіх фарміраванняў падчас вайны 1812 г. на баку арміі Напалеона. Аднак з той нагоды, што падагульняючых манаграфій па гэтай тэме ў айчыннай гістарыяграфіі не існуе, патрэбна спачатку вывучыць тыя даследаванні па гэтай праблеме, якія ўжо былі зроблены.

Айчынную гістарыяграфію можна падзяліць на 2 вялікія перыяды: гістарыяграфія савецкага перыяду і гістарыяграфія к. XX –пач. XXI ст. Яны маюць якасныя адрозненні адзін ад аднаго. Калі ў часы СССР тэма вайны 1812 г. амаль не разглядалася непасрэдна ў дачыненні да тэрыторыі Беларусі, а нешматлікія беларускія даследчыкі ці адлюстроўвалі агульнарасійскі падыход да гэтай праблемы, ці проста аднабакова паказвалі працэсы на беларускіх землях у гэты перыяд, то

пасля 1991 г. увага ў даследваннях айчынных гісторыкаў стала засяроджвацца менавіта на праблемах беларускіх зямель падчас вайны 1812 г., у тым ліку і на тэме беларуска-літоўскіх фарміраванняў ВКЛ у 1812 г. на баку арміі Напалеона.

Праца ў гэтым накірунку вызначаецца вялікай колькасцю артыкулаў, прысвечаных дадзеным праблемам, і ў той жа час адсутнасцю манаграфічных даследаванняў. Існуючыя даследаванні можна ўмоўна падзяліць на тры катэгорыі: артыкулы менавіта па тэме дзейнасці беларуска-літоўскіх фарміраванняў падчас вайны 1812 г. на баку арміі Напалеона [11; 21; 24]; даследаванні па шматлікіх праблемах вайны 1812 г., у тым ліку і становішчы беларускіх зямель у гэты перыяд [13; 14; 22]; краязнаўчыя артыкулы, прысвечаныя аднаму з асобных рэгіёнаў адноўленага ў 1812 г. ВКЛ падчас французска-рускай вайны [5; 19; 23].

Гісторыя вывучэння тэмы вайны 1812 г. расійскімі даследчыкамі пачалася ўжо ў 20-я гг. XIX ст. Дарэвылюцыйная гістарыяграфія зрабіла шмат у працэсе вывучэння вайны 1812 г. Аднак у ёй вайна на тэрыторыі сучаснай Беларусі даследавалася як адзіная з’ява для рускага насельніцтва і насельніцтва Паўночна-заходняга краю. З гэтых падыходаў і ішло вывучэнне становішча беларускіх зямель у гэты перыяд. Але, калі адкінуць гэтыя падыходы, то можна ўбачыць, што гэтыя даследаванні ўтрымліваюць у сабе вялікі фактычны матэрыял.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі можна выдзеліць два тыпы даследаванняў, якія закранаюць праблемы палітыкі Напалеона на беларускіх землях: працы па розных аспектах вайны 1812 г., у якіх беларускія землі разглядаюцца з пункту гледжання арэны баявых дзеянняў французскай і расійскай армій і толькі часткова закранаюць унутранае ўладкаванне адноўленага Напалеонам ВКЛ [3; 4; 15], а таксама краязнаўчыя даследаванні, прысвечаныя становішчу асобных беларуска-літоўскіх рэгіёнаў у адзначаны перыяд [2; 9; 10; 16].

У савецкі перыяд 20–50-х гг. XX ст. тыя напрацоўкі, якія пачалі рабіцца да рэвалюцыі 1917 г. на доўгі час былі пазабыты і тэма вайны 1812 г. і роля ў ёй Беларусі амаль перасталі вывучацца. Фактычны матэрыял, які быў сабраны раней і не падыходзіў да агульнапрынятай савецкай канцэпцыі паказу вайны 1812 г. проста не браўся ў разлік і даследчыкі разглядалі ўсе падзеі ў рэчышчы агульнарасійскага падыходу да гэтых падзей [12; 18; 20].

Першыя даследаванні становішча беларускіх зямель падчас вайны 1812 г. пачалі з’яўляцца толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Але асноўная ўвага надавалася толькі іх эканамічнаму развіццю і паказу змагання беларускага насельніцтва выключна супраць французаў. Асобных даследаванняў беларуска-літоўскіх фарміраванняў падчас вайны 1812 г. на баку арміі Напалеона ў гэты час увогуле не

праводзілася, як, зазначым, і раней [1; 7; 8].

Пасля распаду СССР расійская гістарыяграфія так і засталася, хоць і з абноўленымі ідэямі, але са старымі падыходамі да ролі і месца зямель Беларусі ў падзеях 1812 г. Яна разглядае французска-рускую вайну 1812 г. у разнастайных аспектах: ваенным, ідэалагічным, царкоўна-рэлігійным, маральна-псіхалагічным, сацыяльна-эканамічным, культурным і інш [6; 17]. Аднак пэўнае вывучэнне праблем адноўленага ў 1812 г. ВКЛ, у тым ліку і праблемы ваенных фарміраванняў княства, адсутнічае.

Польская гістарыяграфія вайны 1812 года пачала зараджацца ў пач. ХХ ст. і можна выдзеліць некалькі перыядаў яе фарміравання: даследаванні польскіх аўтараў пач. ХХ ст. і да ўсталявання ў Польшчы камуністычнай улады ў 1945 г., другая палова ХХ ст., звязаная з панаваннем у Польшчы камуністычнай ідэалогіі, канец ХХ-пач. ХХІ ст. – перыяд усталявання ў Польшчы дэмакратычнага ладу.

Даследаванні польскіх гісторыкаў па праблеме створанага ў 1812 г. імператарам Напалеонам ВКЛ можна падзяліць на дзве часткі: працы, прысвечаныя разгляду ролі беларуска-літоўскіх зямель у 1812 г., якія ў тым ліку закранаюць і дзейнасць вайсковых фарміраванняў ВКЛ на баку арміі Напалеона, а таксама нешматлікія краязнаўчыя даследаванні, якія робяць акцэнт на пэўных рэгіёнах сучаснай Беларусі [31].

У цэнтры ўвагі польскай гістарыяграфіі пачатку ХХ ст. знаходзіліся ў асноўным сацыяльна-эканамічныя і гісторыка-прававыя праблемы вайны 1812 г. Распрацоўка гэтых пытанняў падрыхтавала з’яўленне абагульняючых прац, якія і з’явіліся ў гэты перыяд. [28; 29; 30]

У пасляваенны час польскія гісторыкі таксама звярталіся да эпохі напалеонаўскіх войнаў і спрабавалі па новаму пераасэнсаваць падзеі пачатку ХІХ ст. Аднак тут трэба зазначыць пэўны ўплыў на гэтыя даследванні камуністычнай ідэалогіі. Але негледзячы на гэта і ў азначаны перыяд з’ўляліся значныя працы па сацыяльнай, палітычнай і ваеннай гісторыі [27; 33].

У працах сучасных польскіх даследчыкаў прыводзяцца новыя факты, якія не былі даследаваны раней, а таксама робяцца перадавыя высновы. Яшчэ большая ўвага пачала надавацца менавіта ролі беларуска-літоўскіх зямель падчас вайны 1812 г., стала актыўна закранацца і тэма беларуска-літоўскіх фарміраванняў падчас вайны 1812 г. на баку арміі Напалеона [25; 26; 32].

Такім чынам, найбольшай колькасцю даследаванняў па адпаведнай тэме вызначаюцца айчынная і польская гістарыяграфіі. Прычым, айчынныя даследаванні прадстаўлены пераважна ў форме артыкулаў, у той час як у польскай гістарыяграфіі існуюць значныя манаграфіі, у якіх праблеме беларуска-літоўскіх фарміраванняў падчас вайны 1812 г. на баку арміі Напалеона надаецца больш значная ўвага. Зазначым таксама, што расійскія гісторыкі не надаюць вялікай увагі ў сваіх працах, прысвечаных

французска-рускай вайне 1812 г., ролі беларускіх зямель, у тым ліку і праблеме дзейнасці арміі адноўленага Напалеонам у 1812 г. ВКЛ.

**Літаратура**


1. *Аржаева Л, Шапкина Г.* События Отечественной войны 1812 года на Гродненщине (по документам Гродненского исторического архива)// Гродненская правда. 19 июля 1957.
2. *Бориславский М.* События в Вильне в 1812 году. СПб., 1903.
3. *Богданович М. И.* История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам: В 3 т. СПб., 1859–1860. Т. 1–3.
4. *Военский К. А.* Исторические очерки и статьи, относящиеся к 1812 году. СПб., 1912.
5. *Гайба М. П.* Навагрудак. Гістарычны нарыс. Навагрудак, 1992.
6. *Дубровин Н. Ф.* Русская жизнь в начале XIX века. СПб., 2007.
7. *Клюкин Н. В.* Могилёв: Ист.-геогр. и экон. очерк. Мн., 1963.
8. *Корнейчик Е. И.* белорусский народ в Отечественной войне 1812 года. Мінск, 1962.
9. *Краснянский В. Г.* Минский департамент Великого княжества Литовского: ( Эпизод из истории войны 1812 года). СПб., 1902
10. *Краснянский В. Г.* Г. Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 года. Гродна, 1913.
11. *Кудряшов И. Ю.* Вооруженные силы Литовского княжества 1812 г. М., 1991.
12. *Кузнецов Б. И.* Краткий очерк подготовки и развёртывания сторон в 1812 году и Виленская операция. М., 1932.
13. *Лукашэвiч А. М.* Беларусь напярэдадні і ў час вайны 1812 г. Мн., 2004.
14. *Лякин В. А.* Белорусские поля сражений 1812 года: военно-историческая хроника. Мн., 2009.
15. *Ниве П. А.* Отечественная война: (1812–1912 г.). СПб., 1911–1912.
16. *Орловский Е. Ф.* Гродненская губерния в 1812 году: Исторический очерк. Гродно, 1912.
17. *Подмазо А. А.* Большая европейская война 1812-1815: хроника событий. М., 2003.
18. *Покровский М. М. Дипломатия и войны царской России в XIX столетии: Сб. ст. М., 1923.*
19. *Супрун В.* Дзеі над Шчарай: З гісторыі зямлі Слонімскай. Слонім, 2000.
20. *Тарле Е. В.* Нашествие Наполеона на Россию. М., 1938.
21. *Таляронак С., Блінец А.* Апошняя армія ВКЛ (1812–1814 гг.) // Бел. гіст. часоп. 1996. №2.
22. *Таляронак С.* Для Беларусі гэта вайна не была Айчыннай // Звязда. 1992. 16 верас.
23. *Швед В., Данскіх С.* Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў 1805–1815 гады. Гродна, 2006.
24. *Швед В. В.* Фарміраванне і дзейнасць арміі ВКЛ (1812–1815) // Веснік Брэсцкага універсітэта: мовазнаўства, літаратуразнаўства, права, гісторыя, педагогіка. 2000. №1.
25. *Askenazy S.* Napaleon a Polska. Warszawa, 1994.
26. *Bielecki R.* Encyklopedia wojen Napoleonskich. Warszawa, 2001.
27. *Grochulska B.* Handel zagraniczny Ksiestwa Warsawskie. Warszawa, 1966.
28. *Gembarzewski B.* Wojsko polskie. Ksiestwo Warszawskie 1807–1814. Warszawa, 1912.
29. *Iwaszkiewicz J.* Litwa w r. 1812. Krakow, Warszawa, 1912.
30. *Kukiel M.* Litwa i Bialorus a wojska napoleonskie 1812 roku. Lwow, 1935.
31. *Mienicki R.* Ziemia Nowogrodzka w dobie porozbiorowej (1793–1915). Wilno, 1935.
32. *Nawrot D.* Litwa I Napoleon w 1812 roky. Katowice, 2008.
33. *Skowronek J.* Antynapoleonskie Koncepcje Czartoryskiego. Warszawa, 1969.